Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па навуковай рабоце
_______________ В.Р.Языковіч
16.01 _______________ 2020

ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

# Майстэрства вядзення культурна-адпачынкавых праграм

спецыяльнасці перападрыхтоўкі
2-23 02 72 Культурна-адпачынкавая дзейнасць
кваліфікацыя: *арганізатар культурна-адпачынкавай дзейнасці*
у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам перападрыхтоўкі,
зацверджаным 02.08.2016 г., рэг. № 25-13/187

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск, 2020

Распрацоўшчык праграмы:
*В.Л. Гуцько*, дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэкамендавана да зацвярджэння:

Кафедра культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Пратакол пасяджэння ад 14.01.2020 № 1

Савет Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Пратакол пасяджэння ад 16.01.2020 № 1

# УВОДЗІНЫ

Вучэбная праграма па дысцыпліне «Майстэрства вядзення культурна-адпачынкавых праграм» складзена згодна з адукацыйным стандартам перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў па спецыяльнасці 2-23 02 72 «Культурна-адпачынкавая дзейнасць».

Змест праграмы прадугледжвае знаёмства слухачоў з асноўнымі паняццямі тэорыі драмы, спасціжэнне асноўных кампанентаў кампазіцыі драматургічнага дзеяння, раскрыццё і выяўленне спецыфікі розных фармаў культурна-адпачынкавых праграм (далей – КАП), адлюстраванне выканальніцкіх асаблівасцей вядучага КАП розных фармаў, вывучэнне выразных сродкаў і прыёмаў вядзення культурна-адпачынкавых праграм, адлюстраванне прынцыпаў узаемадзеяння вядучага і гледачоў у працэсе рэалізацыі КАП.

Выкладанне дысцыпліны вядзецца з улікам ведаў слухачоў, атрыманых у межах такіх курсаў: «Тэорыя і гісторыя сацыякультурнай дзейнасці», «Тэхналогіі культурна-адпачынкавай дзейнасці», «Акцёрскае майстэрства», «Сцэнічны рух», «Сцэнічная мова».

**Мэта** праграмы: засваенне слухачамі тэарэтычных асноў вядзення культурна-адпачынкавых праграм розных фармаў і авалоданне практычнымі навыкамі іх рэалізацыі.

**Задачы** праграмы:

вывучэнне тэхналагічных асноў стварэння культурна-адпачынкавых праграм;

азнаямленне слухачоў з асаблівасцямі вядзення культурна-адпачынкавых праграм розных форм і жанраў;

засваенне асноўных практычных уменняў вядзення культурна-адпачынкавых праграм розных форм;

фарміраванне навыкаў імправізацыі ва ўмовах узаемадзеяння з аўдыторыяй.

**Метады** навучання: аналіз сітуацый, камунікатыўны (дыскусіі, прэзентацыі, брыфінгі, «мазгавы штурм», дэбаты і інш.), праектны.

**Сродкі** навучання: падручнікі, навучальныя дапаможнікі, дыдактычныя матэрыялы, педагагічныя тэсты, ілюстрацыі.

**Асноўныя патрабаванні да вынікаў навучання** ў рамках праграмы.

Слухачы павінны:

*ведаць:*

асаблівасці вядзення культурна-адпачынкавых праграм розных відаў і форм;

тэхналогію распрацоўкі вобраза вядучага культурна-адпачынкавых праграм розных форм;

камунікацыйныя сродкі выразнасці вядучага культурна-адпачынкавых праграм розных форм;

прыёмы імправізацыйнай тэхнікі вядучага;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыёмы кантакту з аўдыторыяй культурна-адпачынкавых праграм;

*умець:*

ужываць выразныя сродкі і прыёмы вядзення культурна-адпачынкавых праграм з улікам саставу гледачаў;

праводзіць дзейсны аналіз вобраза вядучага культурна-адпачынкавых праграм розных форм;

выкарыстоўваць на практыцы тэхналогію распрацоўкі вобраза вядучага культурна-адпачынкавых праграм розных формаў;

усталёўваць кантакт з гледачамі розных узростаў і катэгорый;

ужываць эфектыўныя прыёмы імправізацыйнай тэхнікі вядучага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Назва тэмы | Колькасць гадзін | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Круглыя сталы, тэматычныя дыскусіі | Лабараторныя заняткі | Дзелавыя гульні | Трэнінгі | Канферэнцыі | Самастойная работа |
| 1 | Вядучы як пазасюжэтны персанаж у драматургіі відовішчных праграм | 10 | 4 | 2 | | | | | | | 4 |
| 2 | Вербальныя і невербальныя сродкі выразнасці вядучага відовішчных праграм | 14 | 6 | 2 | | | | | | | 6 |
| 3 | Спецыфіка вядзення відовішчных праграм розных форм | 20 | 6 | 4 | | | | | | | 10 |
| **Усяго:** | | **44** | **16** | **8** | | | | | | | **20** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

### Тэма 1. Вядучы як пазасюжэтны персанаж у драматургіі відовішчных праграм

Вытокі прафесіі вядучага. Майстэрства канферансье. К.С.Станіслаўскі пра спецыфічныя асаблівасці канферансу. Капуснікі МХТ. Творчасць Н.Ф. Баліева. Тэхналогія «баліеўскага канферансу»: злабадзённасць, водгук на падзеі грамадскага і мастацкага жыцця.

Вядучы відовішчных праграм і мастацтва красамоўства. Моўная дзейнасць і тэорыя камунікацыі. Ступені падрыхтоўкі і выканання моўнага дзеяння: пабуджальнасць да выказвання, унутраны план канструявання выказвання, пераход да прамовы.

Характарыстыка вядучага ў залежнасці ад яго асноўных функцый: вядучы ў якасці інфарматара, каментатара, арганізатара, правакатара ці акцёра. Узаемадзеянне вядучага і гледачоў: блізкадыстанцыйны, далёкадыстанцыйны і сярэднедыстанцыйны тыпы зносін.

Акцёрскія прыёмы і метады як спосаб авалодання рамяством вядучага КАП. Сцэнічны вобраз вядучага. Роля «прапанаваных абставін» (па К.С. Станіслаўскаму) у пошуку сцэнічнага вобраза вядучага.

Імідж вядучага – мастацтва самапрэзентацыі. Паняцці «імідж», «іміджмейкер». Адэкватнасць, арыгінальнасць і пластычнасць іміджу вядучага КАП розных форм. Сродкі фарміравання іміджу вядучага. Псіхалагічныя патрабаванні да іміджу вядучага. Эталонны імідж вядучага.

### Тэма 2. Вербальныя і невербальныя сродкі выразнасці вядучага відовішчных праграм

Моўныя сродкі выразнасці вядучага: прыём градацыі, параўнанне, супрацьпастаўленне, анафара, эпіфара, антытэза, троп, перыфраз, алюзія і інш. Рытарычны зварот і рытарычны вокліч. Іронія, каламбур, парадокс, цытата.

Невербальныя сродкі выразнасці вядучага: міміка, жэсты, поза, рухі. Класіфікацыя жэстава-мімічных сродкаў выразнасці. Умоўныя і няўмоўныя жэсты.

Індывідуальны стыль вядучага: знешні выгляд, манера размаўляць, тэмбр голасу. Асобасныя якасці вядучага: камунікатыўнасць, харызма, пачуццё гумару, імгненнасць рэакцыі, мабільнасць, імправізацыя.

Прафесійныя якасці вядучага: дыкцыя, эрудзіраванасць, акцёрскае майстэрства, уяўленне, памяць. Прыёмы персаніфікацыі вядучых.

Імправізацыя як неад’емная ўласцівасць творчага працэсу вядучага відовішчных праграм. Раптоўнасць і імгненная рэакцыя як вызначальныя прыкметы імправізацыі. Імправізацыя і моўная кампетэнцыя. Паняцці лагічнага і інтуітыўнага мыслення. Рэпрыза ў імправізацыйным канферансе вядучага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Класіфікацыя імправізацыі па структуры і формам яе здзяйснення. Асноўныя этапы імправізацыі: азарэнне; імгненнае асэнсаванне ідэі і пошукі шляхоў яе рэалізацыі; публічнае ўвасабленне ідэі; асэнсаванне здзейсненай імправізацыі і пераход да запланаванага тэксту.

### Тэма 3. Спецыфіка вядзення відовішчных праграм розных форм

Асноўныя віды тэатралізаваных праграм і спецыфіка іх увасаблення. Характарыстыка сродкаў ўздзеяння на аўдыторыю. Псіхолага-педагагічныя асаблівасці дзіцячых тэатралізаваных праграм. Спецыфіка работы вядучага ў дзіцячай тэатралізаванай праграме. Калектыўнае вядзенне праграмы. Роля і вобраз, створаныя на аснове літаратурных персанажаў. Пераўвасабленне.

Характарыстыка гульнёвых праграм. Удзельнікі гульні (конкурсу) як галоўныя выканаўцы на пляцоўцы. Вядучы гульнявых і конкурсна-забаўляльных праграм - рэжысёр і каардынатар дзеяння. Спалучэнне ў канферансу вядучага імправізацыйнага пачатку і дакладна прадуманых дзеянняў. Мабільнасць і пазнавальнасць іміджу вядучага гульнявых і конкурсна-забаўляльных праграм. «Рэжысура аўдыторыі» гульнявых і конкурсна-забаўляльных праграм. Правакацыя як сродак актывізацыі ўдзельнікаў і гледачоў праграмы. Нязменнасць асобных элементаў гульнявых і конкурсна-забаўляльных праграм: правілы гульні (конкурсу), удзельнікі, падвядзенне вынікаў праграмы.

Вядзенне канцэртных праграм. Віды канцэртаў. Рэжысёрская задума канцэрта. Прынцыпы адбору нумароў у канцэрт і арганізацыя рэпетыцый. Мантаж мастацка завершанага нумара як спецыфічная рыса праграмы. Вядучы канцэрта як арганізатар пазасюжэтнай сувязі паміж нумарамі праграмы. Прафесійныя навыкі вядучага канцэртных праграм: дынамічнасць і лёгкасць канферансу. Імправізацыйная творчасць вядучага канцэртных праграм. Стылістычныя асаблівасці правядзення канцэртных праграм. Усталёўванне ступені блізкасці гледачоў і выканаўцаў, «размова з залам», «вядзенне» гледачоў па канцэрту, аб'яднанне гледачоў і выканаўцаў на сцэнічнай пляцоўцы.

Вядзенне свята. Тыпалогія свят. Асаблівасці стварэння святочнай атмасферы. Эмацыянальная выразнасць уздзеяння цырыманіялу свята. Эстэтычная прывабнасць, мастацкая паўнавартаснасць і выразнасць усяго свята і асобных яго элементаў. Дакладнасць і зладжанасць дзеяння выканаўцаў і гледачоў мерапрыемства. Выразныя сродкі рэжысуры масавых свят. Пільная прапрацоўка ўсяго комплексу святочных нумароў і эпізодаў і парадку іх увасаблення. Арганізацыя сцэнічнай прасторы ва ўмовах правядзення святаў на адкрытых пляцоўках. Характарыстыка выразных сродкаў святочных праграм: мастацкае слова і слова вядучага, музыка, кіна- і відэаматэрыялы, свет і гук. Імправізацыя як фундаментальная аснова правядзення свята. Характарыстыка сродкаў уздзеяння на аўдыторыю свята. Спантаннасць паводзінскай рэакцыі гледачоў і навыкі кіравання ёю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ САМАСТОЙНАГА ВЫВУЧЭННЯ

## Тэма 1. Вядучы як пазасюжэтны персанаж у драматургіі відовішчных праграм

### *Пытанні*

1. Характарыстыка вядучага ў залежнасці ад яго асноўных функцый: вядучы ў якасці інфарматара, каментатара, арганізатара, правакатара ці акцёра.

2. Паняцці «імідж», «іміджмейкер». Адэкватнасць, арыгінальнасць і пластычнасць іміджу вядучага культурна-адпачынкавых праграм розных форм.

3. Сродкі фарміравання іміджу вядучага. Псіхалагічныя патрабаванні да іміджу вядучага. Эталонны імідж вядучага.

### *Спіс рэкамендаванай літаратуры*

1. Рукша, Г.Л. Ремейк в современной культурно-досуговой деятельности: практика применения / Г.Л. Рукша // Обсерватория культуры. – 2013. – № 4. – С. 96–101.

2. Панасюк, А.Ю. Формирование имиджа: стратегия, психотехнологии, психотехники / А.Ю.Панасюк. – М. : Омега-Л, 2007. – 266 с.

## Тэма 2. Вербальныя і невербальныя сродкі выразнасці вядучага відовішчных праграм

### *Пытанні*

1. Індывідуальны стыль вядучага: знешні выгляд, манера размаўляць, тэмбр голасу.

2. Асобасныя якасці вядучага: камунікатыўнасць, харызма, пачуццё гумару, імгненнасць рэакцыі, мабільнасць, імправізацыя.

3. Імправізацыя як неад'емная ўласцівасць творчага працэсу вядучага відовішчных праграм.

4. Мабільнасць і пазнавальнасць іміджу вядучага гульнявых і конкурсна-забаўляльных праграм.

### *Спіс рэкамендаванай літаратуры*

1. Вилсон, Глен. Язык жестов / Глен Вилсон, Крис Макклафин. – СПб. : Питер, 2001. – 224 с.

2. Рудь, Л.Г. Культура речи: учеб. пособие / Л.Г. Рудь,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

И.П. Кудреватых, В.Д. Стариченок; под ред. В.Д.Стариченка. – Минск : Вышэйшая школа, 2005. – 271 с.
3. Герасимова, О.А. Мастерство шоумена: учеб. пособие / О.А. Герасимова. – Ростов н/Д : Феникс, 2006. - 192 с.

## Тэма 3. Спецыфіка вядзення відовішчных праграм розных форм

### *Пытанні*

1. Асноўныя віды тэатралізаваных праграм і спецыфіка іх увасаблення.
2. Характарыстыка выразных сродкаў святочных праграм: мастацкае слова і слова вядучага, музыка, кіна- і відэаматэрыялы, свет і гук.
3. Арганізацыя сцэнічнай прасторы ва ўмовах правядзення святаў на адкрытых пляцоўках.
4. Сродкі ўздзеяння на аўдыторыю свята.
5. Характарыстыка гульнёвых праграм. Удзельнікі гульні (конкурсу) як галоўныя выканаўцы на пляцоўцы.
6. Нязменнасць асобных элементаў гульнёвых і конкурсна-забаўляльных праграм: правілы гульні (конкурсу), удзельнікі, падвядзенне вынікаў праграмы.
7. Стылістычныя асаблівасці правядзення канцэртных праграм.

1. Горюнова, И.Э. Режиссура массовых театрализованных зрелищ и музыкальных представлений. Лекции и сценарии / И.Э. Горюнова. – СПб. : Композитор, 2009. – 232 с.
2. Гуд, П.А. Тэхналогія стварэння свята : Вуч.дапам. – Мінск: БДУК, 2004. – 224 с.
3. Мазура, В.Я. Здабыткі і праблемы сучаснага беларускага эстраднага мастацтва і шляхі развіцця айчыннага шоу-бізнесу / В.Я. Мазура / Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва / Нац. Бібліятэка Беларусі. – Вып. 5. – Мінск, 2002. – С. 76–80.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Форма бягучай атэстацыі – залік.**

# МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ БЯГУЧАЙ АТЭСТАЦЫІ СЛУХАЧОЎ

У якасці заліковай работы слухачы ўяўляюць сябе ў якасці вядучага абранай імі формы культурна-адпачынкавай праграмы (тэматычная вечарына, сюжэтна-гульнявая праграма, конкурсна-забаўляльная праграма, тэатралізаваны канцэрт, капуснік і г.д.). На этапе падрыхтоўкі да іспыту слухач самастойна рыхтуе тэкст вядучага, а таксама выбірае сродак мастацкай выразнасці: музычнае афармленне, відэарад.

Падчас іспыту група слухачоў выступае ў якасці гледачоў. Слухачы павінны прадэманстраваць уменне і навыкі падрыхтоўкі тэксту з выкарыстаннем сродкаў моўнай выразнасці, а таксама ўжываць невербальныя сродкі зносін непасрэдна падчас заліку.

## Пытанні да заліку

1. Вядучы відовішчных праграм і мастацтва маўлення.
2. Эталонны імідж вядучага. Сродкі фарміравання іміджу вядучага. Псіхалагічныя патрабаванні да іміджу вядучага.
3. Моўныя сродкі выразнасці вядучага. Імправізацыя.
4. Асноўныя віды тэатралізаваных праграм і спецыфіка іх увасаблення.
5. Характарыстыка гульнёвых праграм. Удзельнікі гульні (конкурсу) як галоўныя выканаўцы на пляцоўцы. Нязменнасць элементаў гульні.
6. Віды канцэртаў. Рэжысёрская задума канцэрта. Усталяванне ступені блізкасці гледачоў і выканаўцаў.
7. Тыпалогія свят і іх характарыстыка.
8. Асаблівасці стварэння святочнай атмасферы. Эмацыянальная выразнасць уздзеяння цырыманіялу свята. Эстэтычная прывабнасць свята і асобных яго элементаў.
9. Выразныя сродкі рэжысуры масавых свят. Пільная перапрацоўка агульнага комплексу святочных нумароў і эпізодаў і парадку іх увасаблення.
10. Арганізацыя сцэнічнай прасторы ва ўмовах правядзення святаў на адкрытых пляцоўках.
11. Характарыстыка выразных сродкаў святочных праграм: мастацкае слова і слова вядучага, музыка, кіна- і відэаматэрыялы, свет і гук.
12. Імправізацыя як фундаментальная аснова правядзення свята.
13. Характарыстыка сродкаў уздзеяння на аўдыторыю свята. Спантаннасць эмацыянальнай рэакцыі гледачоў і навыкі кіравання ёю.
14. Тэндэнцыі развіцця сродкаў мастацкай выразнасці ў музыцы і гукарэжысуры. Сучасныя тэхнічныя сродкі мастацкай выразнасці.
15. Сучасныя аўдыяльныя тэхналогіі і іх патэнцыял у стварэнні музычнага вобразу.
16. Сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці рознаўзроставых катэгорый

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гледачоў.

17. Тыпалогія памяшканняў і асаблівасці ўладкавання аўдыторыі гледачоў.

18. Асаблівасці арганізацыі аўдыторыі гледачоў на адкрытых пляцоўках.

19. Асаблівасці арганізацыі аўдыторыі гледачоў у зачыненых памяшканнях.

20. Асноўныя функцыі і прынцыпы падбору музыкі для культурна-адпачынкавых праграм.

21. Тэхналогія распрацоўкі музычна-шумавой партытуры ў рознажанравых культурна-адпачынкавых праграмах.

22. Развіццё сінтэзаваных музычна-мастацкіх праектаў у XXI стагоддзі.

23. Тыпалогія сінтэзаваных музычна-мастацкіх праектаў.

24. Этапы развіцця сцэнаграфіі.

25. Асноўныя функцыі сцэнаграфіі культурна-адпачынкавых праграм.

26. Тэхнічнае абсталяванне сучаснай пляцоўкі ў культурна-адпачынкавых праграмах.

27. Роля дэкарацыйнага афармлення ў сцэнаграфіі.

28. Забеспячэнне тэхнікі бяспекі падчас эксплуатацыі музычнага, асвятляльнага і іншага абсталявання і апаратуры.

29. Касцюм, парык і грым як кампаненты мастацкага афармлення культурна-адпачынкавых праграм.

30. Прынцыпы арганізацыі рэкламнай кампаніі і афармлення афіш культурна-адпачынкавых праграм.

Другое пытанне ў білеце «Аргументацыя падбору шэрагу гульняў, музыкі і шумоў у распрацаванай партытуры альбо рэжысёрска-пастановачным плане».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

## *Асноўная*

1. Гуд, П. А. Тэхналогія стварэння свята : вучэбны дапаможнік / П.А. Гуд. – [2-е выд., стэр.]. – Мінск : [б. в.], 2008. – 222 с.

2. Герасимова, О.А. Мастерство шоумена: учеб. пособие / О.А. Герасимова. – Ростов н/Д : Феникс, 2006. - 192 с.

3. Горюнова, И.Э. Режиссура массовых театрализованных зрелищ и музыкальных представлений. Лекции и сценарии / И.Э. Горюнова. – СПб. : Композитор, 2009. – 232 с.

4. Казарцева, О. М. Культура речевого общения: Теория и практика обучения: учеб. пособие / О.М.Казарцева. – М. : Флинта: Наука, 1998. – 496 с.

5. Кох, И.Э. Основы сценического движения : учебник / И. Э. Кох. – Изд. 2-е, испр. – Санкт-Петербург ; Москва ; Краснодар : Планета музыки : Лань, 2010. – 509 с.

6. Лысикова, О.В. Имиджелогия и паблик рилейшнз в социокультурной сфере: учеб. пособие / О.В. Лысикова, Н.П. Лысикова. – М. : Флинта: МПСИ, 2006. – 168 с.

7. Макарова, Е.А. Технологии культурно-досуговой деятельности : пособие для работников культуры / Е.А. Макарова, С.Б. Мойсейчук, И.Л. Смаргович. – Минск : Владимир Сивчиков, 2016. – 173 с.

8. Мельников, И. Сценарии и организация корпоративных праздников / И. Мельников, В. Мороз. – М. : Современная школа, 2006. – 256 с.

9. Мойсейчук, С.Б. Режиссура культурно-досуговых программ : учебно-методическое пособие / С. Б. Мойсейчук. – Минск, 2011. – 98 с.

10. Панасюк, А.Ю. Формирование имиджа: стратегия, психотехнологии, психотехники / А.Ю.Панасюк. – М. : Омега-Л, 2007. – 266 с.

11. Рудь, Л.Г. Культура речи: учеб. пособие / Л.Г. Рудь, И.П. Кудреватых, В.Д. Стариченок; под ред. В.Д.Стариченка. – Минск : Вышэйшая школа, 2005. – 271 с.

12. Рукша, Г.Л. Ремейк в современной культурно-досуговой деятельности: практика применения / Г.Л. Рукша // Обсерватория культуры. – 2013. – № 4. – С. 96–101.

13. Сценическая речь : Учебник / Под ред. И.П. Козляниновой и И.Ю. Промптовой. – 3-е изд. – М. : Изд-во «ГИТИС». – 2002. – 511 с.

14. Технология социально-культурной деятельности : учебно-методическое пособие для студентов учреждений высшего образования по специальности 1-23 01 14 Социально-культурная деятельность / Л.И. Козловская [и др.] ; [рец.: В. Н. Наумчик, С. А. Валаханович]. – Минск : БГУКИ, 2014. – 205 с.

15. Тимофеев, О.Н. Анимационная деятельность в индустрии гостеприимства / О.Н. Тимофеев. – Уфа : УГАЭиС, 2005. – 128 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

16. Шепель, В.М. Имиджелогия: секреты личного обаяния / В.М. Шепель. – Ростов н/Д : Феникс, 2005. – 473 с.
17. Шубина, И.Б. Драматургия и режиссура зрелища: Игра, сопровождающая жизнь: учеб.-метод. пособие / И.Б. Шубина. – Ростов н/Д : Феникс, 2006. – 288 с.

### *Дадатковая*

1. Вилсон, Глен. Язык жестов / Глен Вилсон, Крис Макклафин. – М. : 2010. – 532 с.
2. Ворошилов, В. Феномен игры / В. Ворошилов. – М. : Сов. Россия, 1982. – 128 с.
3. Кембелл, А. Вечеринка в большой компании / А. Кембелл. – М.: Айрис- Пресс, 2005. – 256 с.
4. Новикова, Г.Н. Технологические основы социально-культурной деятельности : учебное пособие / Г.Н. Новикова. – Изд. 3-е, испр. и доп. – М. : МГУКИ, 2010. – 157 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ